*Жылінская Т. Г.,*

старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

# ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ ЯК ТВОРЧЫ МЕТАД СЦЭНАРЫСТА КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВЫХ ПРАГРАМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Культурна-адпачынкавая праграма — форма мастацкага мадэлявання навакольнага свету ў гульнёвай тэатральна-мастацкай дзейнасці ўсіх удзельнікаў, уцягнутых у яе кола.

Сцэнарый — гэта спосаб фіксацыі культурна-адпачынкавай праграмы ў форме літаратурна-рэжысёрскага апісання з апорай на псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі. Ён, несумненна, запазычвае і акумулюе ў сабе агульныя ўласцівасці драматургіі, але ў той жа час мае і свае спецыфічныя асаблівасці:

- комплексны характар арганізацыі на базе дакументальна-публіцыстычнага матэрыялу;
- характар узаемадзеяння ўсіх удзельнікаў;
- разнастайныя формы правядзення.

Сцэнарыст, аўтар сцэнарыя, — той чалавек, які непасрэдна фіксуе пастановачную задуму. Працэс стварэння пастановачнай задумы ў культурна-адпачынкавай праграме не заўсёды індывідуальны, і ўсё ж за чалавекам, які стварае асноўную драматургічную канву будучай пастаноўкі з наступнай яе дапрацоўкай у якасці сцэнарыя, застаецца права на назву.

Перад сцэнарыстам культурна-адпачынкавай праграмы перш за ўсё стаіць задача злучэння і арганізацыі ў адзінае, кампазіцыйна-эстэтычнае цэлае розных узроўняў сацыяльна-значнай інфармацыі:

мастацка-вобразнага;
актыўна-дзейснага;
інфармацыйна-лагічнага.

Ступень злучэння заўсёды залежыць ад спалучэння фактараў як у драматургіі, так і ў рэжысуры і можа вагацца ад простых формаў да складаных. Пры гэтым узровень іх уздзеяння на гледача не заўсёды адназначна спалучаецца абранымі намаганнямі. Але, тым не менш, трэба адзначыць, што шчырая, праўдзівая і прафесійная работа, зробленая менавіта для гледача, а не для дэманстрацыі ўласнага майстэрства, апялюе да эмоцый тых, хто знаходзіцца ў зале, і падкупляе іх.

На нашу думку, адзін з самых перспектыўных метадаў такога злучэння на сучасным этапе развіцця канцэпцыі распрацоўкі культурна-адпачынкавых

праграм — метад тэатралізацыі. Ён прадугледжвае сінтэзаванне кампазіцыйнага пачатку, данясенне сацыяльна-значнай інфармацыі на фоне вобразнага рашэння. Прычым метад мае дастатковы набор якасных элементаў выкарыстання самадзейных удзельнікаў як у перыяд падрыхтоўкі, так і ў імправізацыйных момантах пры старанна спланаваным выступленні.

Тэатралізацыя прадугледжвае наяўнасць асаблівай псіхалагічна-творчай атмасферы, характэрнай для сапраўднай тэатральнай дзеі, выкліканай паўнавартаснай драматургіяй, якая мае тэму, ідэю, драматычную сітуацыю, пяць структурных элементаў сцэнарыя, адзін ці два з чатырох відаў канфлікту, неабходны набор сродкаў і метадаў, які сёння выдзелены ў тэорыі і практыцы стварэння драматургічнага тэксту. Акрамя таго, тэатралізацыя патрабуе асаблівага погляду рэжысёра-пастаноўшчыка. Не выключана, што ў падрыхтоўцы культурна-адпачынкавай праграмы і сцэнарыст, і рэжысёр-пастаноўшчык — гэта адна асоба. І аб’ём творчага пасылу і імпульсу ў такім выпадку ўзрастае.

Безумоўна, у аснову метаду тэатралізацыі павінна быць пакладзена нейкая падзея, з якой нараджаецца гісторыя. Прычым змест апошняй можа вагацца ў вельмі вялікім дыяпазоне: ад бытавой замалёўкі з ярка выяўленымі характарамі дзеючых асоб да такой з’явы сучаснасці, якая здольная згуртаваць масы ў адзіным эмацыянальным парыве. Каб граматна раскрыць гісторыю, трэба абавязкова:

вызначыць у ёй тэму — матэрыял для гісторыі і яго ацэнку;

ідэю — характары персанажаў, іх шлях да канфлікту і фінал;

драматычную сітуацыю — становішча герояў, якое пераадольвае магчымасці іх характараў;

раскрыць усе калізіі ў пяці структурных элементах сцэнарыя — экспазіцыі, абавязковай сцэне, крызісным моманце, драматычных перыпетыях і кульмінацыі.

Пасля гэтага можна можна брацца за пастаноўку метадам тэатралізацыі. Прычым неабходна мець на ўвазе, што дадзены метад можа пранізваць як усю культурна-адпачынкавую праграму, так і адну або некалькі яе частак.

Але веданне законаў драматургічнай пабудовы і спалучэння — гэта яшчэ не залог поспеху самой праграмы. Тут патрабуецца і рэжысёрска-пастановачнае ўменне арганізаваць сцэнарны матэрыял з дапамогай розных прыёмаў (кантрасных і мантажных) дэкаратыўна-мастацкага афармлення (прасторавых кампазіцый), якія дапаўняюць агульную атмасферу пастаноўкі.

Варта памятаць, што арганізацыя культурна-адпачынкавых праграм на аснове абстрактна сканструяваных сцэнарыяў без ведання законаў і заканамернасцей творчага працэсу, без глыбокага мастацкага і дакументальнага даследавання не дае станоўчых вынікаў, прыводзіць да страты даверу аўдыторыі гледачоў, зніжае аўтарытэт установы культуры.

Культурна-адпачынкавыя праграмы з элементамі тэатралізацыі або пастаўленыя цалкам метадам тэатралізацыі — гэта заўсёды комплекс, які змя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шчае ў сабе асаблівую эмацыянальную атмасферу, што пераводзіць першы ўзровень успрымання гледача (цікавасць) у больш высокі (суперажыванне) і ідэнтыфікацыю сябе з дзеючымі асобамі. Любая тэатралізаваная пастаноўка будзе ўключаць:

1) сімвалічны блок, заснаваны на рытуальнасці і пераемнасці: пачатак — фінал, сустрэча — провады, завязка — кульмінацыя; цырыманіял, калі ён неабходны (узнагароджанні, віншаванні і г.д.);

2) забаўляльны блок, які прадугледжвае актыўныя сітуацыйныя зносіны і варыятыўнасць разнастайных формаў культурна-адпачынкавай дзейнасці;

3) відовішчны блок, заснаваны на нумарным, дэкарацыйным і святламузычным рашэннях, які ўключае ў сябе актыўны гульнёвы пачатак.

Метад тэатралізацыі, добра распрацаваны ў тэорыі і практыцы, у пачатку ХХ ст. выклікаў да жыцця новы прафесійны напрамак — рэжысёрска-сцэнарны. На сённяшні дзень ён папаўняецца новымі ведамі ў галіне асноўных тэндэнцый і інтанацый сучаснага свету, а таксама з дапамогай сінтэзавання разнастайных формаў. І ў гэтым ракурсе метад тэатралізацыі па-ранейшаму ўяўляе сабой найбольш перадавы метад арганізацыі сцэнічнага матэрыялу.

Матэрыялам для тэатралізацыі можа з’явіцца як часопісная паласа, філасофскі трактат, медыцынская нататка, так і мастацкая літаратура. Галоўнае тут — знайсці агульную тэму і ідэю. Трэба памятаць, што празмернае калейдаскапічнае ці рэзкае мільгаценне дзеянняў парушыць той асацыятыўны рад, які сцэнарыст і рэжысёр намагаліся стварыць у гледача.

Так, адзін з самых распаўсюджаных прыёмаў — прыём кантрасту, які заснаваны на сутыкненні працілеглых з’яў, заўжды цікава падкрэслівае канфліктнасць драматургічнай задумы. Але ж, у адрозненне ад драматургічнага твора, сюжэт сцэнарыя заўжды аслаблены, нават тады, калі гаворыцца аб літаратурна-музычнай тэатралізацыі. Таму не заўсёды правамоцны антыподы, супрацьлегласці і іншыя кантрасты, якія расквечваюць канцэртную пляцоўку.

Існуе яшчэ нямала цяжкасцей у кампазіцыйнай пабудове сцэнарыя метадам тэатралізацыі. Найбольш распаўсюджаная — увядзенне пасля кульмінацыі (якая, як памятаем, з’ўляецца маральна-этычным вынікам) тлумачэння гледачу пра тое, што адбылося.

Вельмі часта, нават у тэтралізаваным прадстаўленні, выступаюць з доўгімі прамовамі аб «агульнавядомым», для чаго чытаюць іх па паперцы. Такія моманты трэба абавязкова прагаворваць загадзя і асэнсоўваць іх з дапамогай папярэдніх і наступных эпізодаў.

Неабходна дамагчыся, каб кожны нумар праграмы ці дзеяння быў успрыняты аўдыторыяй з цікавасцю. Але ж, з другога боку, пажадана смялей эксперымен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таваць, інакш аўтар сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы не зможа адысці ад штампаў і стэрэатыпнага асвятлення рэчаіснасці.

Сучасная культурна-адпачынкавая праграма, пастаўленая з дапамогай метаду тэатралізацыі, несумненна, насычана інтэлектуальнымі знаходкамі, падводкамі да ідэі і інфармацыйна-пазнавальнымі момантамі. Яна рацыянальная, мае практычныя мэты, задавальняе асабістыя патрэбы ўдзельнікаў і ў той жа час рамантычная. Гэта значыць, што праграма ўтрымлівае ў сабе нешта незвычайнае і акружана арэолам выключнасці. А сінтэз формаў дае тую перавагу, у якой добра прачытваюцца наступныя характарыстыкі: мабільнасць, інтэграцыйнасць, шматгалоссе, нечаканасць эфектаў, парадаксальнасць спалучэнняў і інш. Гэта выдатная магчымасць для рэалізацыі творчага патэнцыялу рознахарактарных удзельнікаў у рамках адной культурна-адпачынкавай праграмы.

Спіс выкарыстаных крыніц

Генкин, Д. М., Конович, А. А. Сценарное мастерство культпросветработника / Д. М. Генкин, А. А. Конович. — М. : Сов. Россия, 1994. — 123 с.

Мішчанчук, У. А. Майстэрства акцёра / У. А. Мішчанчук. — Мінск : Полымя, 2000. — 110 с.

Соснова, М. Л. Искусство актера : учеб. пособие для вузов / М. Л. Соснова. — М. : Академ. проект : Фонд «Мир», 2005. — 432 с.

Театр [Электронный ресурс] : энциклопедия по материалам изд-ва «Большая энциклопедия» : в 3 т. — Электрон. дан. (486 Мв). — М. : Кордис-Медиа, 2003.

Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭН, 2002 — 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ